

***М.І.Латыш,***
*доктар філасофскіх навук, прафесар,*
***Ю.Э.Красноў,***
*навуковы супрацоўнік,*
***А.А.Палоннікаў,***
*кандыдат псіхалагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік НІА*

# Парадыгмальныя зрухі ў адукацыі і педагагічнай навуцы

*Сацыякультурная трансфармацыя грамадства абумоўлівае відавочныя карэнныя змены адукацыйнай сітуацыі на Беларусі. Новыя тыпы навучальных устаноў, якія яшчэ нядаўна выклікалі насцярожанасць педагагічнай грамадскасці, сталі прывычнай з'явай адукацыйнага ландшафту. У раскладах заняткаў з'явіліся нязвыклыя прадметы (гуманістыка, культуралогія, філасофія, агульнае прыродазнаўства і г.д.), усё часцей адкрываюцца прыватныя, кааператыўныя і грамадскія адукацыйныя ўстановы, шырокае распаўсюджванне атрымліваюць альтэрнатыўныя традыцыйным педагагічныя прыёмы і тэхналогіі.*

*А як жа педагагічная навука? Ці падрыхтавана яна да асэнсавання навацый, ці здольна ўпісаць іх у прыдатныя адукацыйныя нішы, адказаць на пастаўленыя часам пытанні пра характар і перспектывы зменаў у адукацыі, іх адпаведнасць новым патрэбам і якасці жыцця людзей, змену каштоўнасцей у культурнай спадчыне? Гэтыя пытанні няпростыя і больш таго — не маюць адназначнага прамога адказу.*

*Справа ў тым, што сама педагагічная навука сёння знаходзіцца ў стане радыкальных пераўтварэнняў, рознанакіраваных змен і ўяўленняў. З'яўляючыся складанаарганізаваным сацыякультурным феноменам, часткай нашага агульнага жыцця, яна — як спецыфічная сфера чалавечай практыкі — выпрабавала на сабе ўсе ілюзіі і метамарфозы гісторыі, апошняга яе таталітарнага этапа і, натуральна, выклікала адпаведныя наступствы, уплыў якіх на навучанне і выхаванне маладога пакалення выяўляецца зараз і выявіцца ў будучым.*

*Безумоўна, умовы функцыянавання і развіцця педагогікі істотна змяніліся. Адышлі ў мінулае метадалагічны і ідэалагічны прымус, знікла "жалезная заслона", з'явілася магчымасць звароту да нацыянальна-гістарычнай спадчыны. Гэтыя і іншыя абставіны пабуджаюць педагагічную навуку да большых дынамізму і рознабаковасці, актыўнай рэфлексіі як свайго прадмета, так і грамадскіх ідэалаў і каштоўнасцей, навуковай карціны свету, сродкаў і працэдур даследчай дзейнасці. Інакш кажучы, узрастае ўдзельная вага метадалагічных пошукаў, іх культуратворчая місія.*

*Аўтары апублікаванага ніжэй тэксту не прэтэндуюць на ролю носьбітаў "абсалютнай ісціны", а прапануюць зацікаўленаму чытачу свае разважанні пра магчымасці, пераважныя шляхі і перспектывы развіцця педагагічнай навукі ў краіне. Гэтыя разважанні — не строга структураваны і лагічна бездакорны пункт погляду. Хутчэй за ўсё, прапанаваны матэрыял — толькі першаснае абазначэнне тэарэтыка-метадалагічных праблем, абмеркаванне якіх навуковай грамадскасцю магло б служыць, на наш погляд, складванню беларускай педагагічнай даследчай праграмы.*

*Адна з ключавых ідэй артыкула заключаецца ў тым, што змены ў адукацыі пачынаюцца не са змянення педагагічнай практыкі самой па сабе, а з пераўтварэння структур нашага мыслення аб свеце і яго пазнанні. Развіццю ж мыслення спрыяюць, як вядома, дыялог, прадуктыўная і абгрунтаваная дыскусія, на якую і спадзяюцца аўтары.*

Вырашэнне чалавечых праблем, якія з цягам часу ўскладняюцца ўсё больш і больш, цесна звязана з канструяваннем эфектыўнай адукацыйнай прасторы. Апошняя дае жыццё і падтрымку розным падыходам і спосабам навучання і выхавання і шырокія магчымасці для эксперыментавання, мадэлявання педагагічнай дзейнасці з мэтай задавальнення сацыяльных запатрабаванняў грамадства і асабістых запытаў людзей. З гэтага пункту гледжання, несумненна, што XXI ст. зробіцца стагоддзем адукацыі. Вось толькі якой? Традыцыйнай, пабудаванай на механістычных уяўленнях XIX ст., або прынцыпова новай, што імкнецца адказаць на выклікі часу і ўлічвае найноўшыя дасягненні прыродазнаўчых і гуманітарных навук. Натуральна, новай. Тады ў чым тут навізна падыходаў, метадаў, тэхналогій?

На нашу думку, адукацыя новага тысячагоддзя будзе характарызавацца складаннем і рэалізацыяй новага адукацыйнага праекта. Выкарыстанне тэрміна "праект" звязана з тым, што адукацыя ўяўляецца не як працэс і вынік "натуральнай" эвалюцыі цяперашняй педагагічнай сістэмы, а як прадукт свядомага канструявання многімі грамадскімі суб'ектамі новай адукацыйнай практыкі.

Той велізарны інтэлектуальны і практычны патэнцыял, які быў зададзены адукацыі педагагічнай сістэмай Я.А.Коменскага і які ўзняў чалавецтва ад сярэднявечча да вышынь навукі і цывілізацыі XX ст., у наш час аказаўся вычарпаным і больш не адпавядае ні сучаснай навуковай карціне свету, ні патрэбам далейшага развіцця цывілізацыі. Узнікла неабходнасць у парадыгмальных зрухах у пераглядзе канцэптуальных асноў, прынцыпаў і спосабаў арганізацыі і ажыццяўлення адукацыі.

Наступныя сацыякультурныя фактары і тэндэнцыі выступаюць падставамі для змены адукацыйнай парадыгмы:

**Глабальныя**

1. Новая навуковая карціна свету, заснаваная на нелінейным мысленні, уяўленне пра Сусвет як пра адкрытую, з самастойным рэгуляваннем макрасістэму з антынамічнымі ўласцівасцямі, што ўключаюць існаванне супрацьлеглых узаемавыключных спосабаў быцця (напрыклад, выпадковасці і неабходнасці, парадку і хаатычных устойлівасцяў). Яна ахоплівае і сацыяльныя формы жыцця, г.зн. у паняцце "прырода" ўключаецца арганічнае ўзаемадзеянне ўсіх матэрыяльных, энергетычных і інфармацыйных працэсаў, а таксама суб'ект-суб'ектныя адносіны.

2. Фармаванне ў чалавека пазіцыі планетарнага суб'екта, змена тыпу сацыякультурнай спадчыны, складванне

інтэлектуальна насычаных грамадскіх практык (новых тыпаў гаспадарання, сацыяльных сувязяў і супрацоўніцтва).

3. Змяненне тыпу навуковасці. Аб'ектыўна-даследчая навуковасць змяняецца праектна-праграмнай, практыкаарыентаванай, што ўзмацняе ўзаемасувязь паміж кіраўніцкай, навукова-даследчай і інжынерна-распрацоўчай дзейнасцю.

4. "Зрух улады" (Э.Тофлер). Пераход ад рэалізацыі ўлады праз пераважна сілавыя формы і формы, заснаваныя на матэрыяльным багацці, да ўлады ведаў, якая базуецца на сучасных спосабах апрацоўкі інфармацыі і сінтэзе ведаў.

5. Узрастанне ролі і значэння сацыяльнай (культурнай) кваліфікацыі спецыяліста ў адносінах да спецыяльнай (прафесійнай) кваліфікацыі, г.зн. яго здольнасці жыць і тварыць у пэўным прафесійным (культурна-тэхналагічным) полі, будаваць у ім новыя спосабы мыслення і дзейнасці, камунікатыўныя сувязі.

Адразу адзначым, што працэсы глабалізацыі і універсалізацыі чалавечага жыцця па-новаму ставяць праблему "малой радзімы", робяць больш вострай неабходнасць сацыякультурнай ідэнтыфікацыі, павышаюць адказнасць індывіда за канкрэтнае дзеянне, прымушаюць у малым (мясцова-рэгіянальным) бачыць вялікае (планетарнае), асабіста вырашаць праблемы свайго часу (мысліць глабальна, дзейнічаць лакальна).

**Рэгіянальныя**

1. Набыццё посткамуністычнымі краінамі, у тым ліку і Беларуссю, нацыянальна-дзяржаўнай незалежнасці, а значыць, узнікненне неабходнасці ў пабудове незалежнай, з самастойным развіццём, нацыянальнай сістэмы адукацыі.

2. Тэхніка-тэхналагічнае і сацыяльна-культурнае становішча краіны ў межах "даганяльнай мадэрнізацыі", што патрабуе велізарных намаганняў па дасягненні ўзроўню развітых краін, у тым ліку і ў першую чаргу — праз абнаўленне сістэмы адукацыі і павышэнне яе якасці.

3. Дэідэалагізацыя грамадскай свядомасці, дэмакратызацыя сацыяльных адносін, фармаванне структур грамадзянскай супольнасці, што патрабуе ўзмацнення гуманітарнага і этычнага кампанентаў адукацыі.

4. Сцвярджэнне каштоўнасцяў асабістага, прыватнага жыцця (свабоды, самарэалізацыі, адказнасці).

На думку многіх спецыялістаў, адзначаныя глабальныя фактары вядуць да стварэння ў XXI ст. новай антрапагеннай (наасфернай) цывілізацыі, што пераадольвае тэхнакратычны светапогляд індустрыяльнай эпохі. Яна фармуе запатрабаванні на асобу, здольную да культурна-гістарычнага самавызначэння і творчасці ў складаных абставінах жыцця з яго дынамічнымі зменамі.

Найбольш важнай сістэмаўтваральнай асновай праекта, які толькі нараджаецца, павінна зрабіцца этычнае вымярэнне чалавечага існавання ў свеце. Яно атрымае развіццё ў наасферы (У.І.Вярнадскі), дзе чалавечы розум, каштоўнасці, мэты, воля будуць "сцягваць" у адзінае цэлае ўсю сукупнасць працэсаў у прыродным, сацыяльным і тэхнічным свеце. Прычым ва ўмовах нарастальнай узаемазалежнасці людзей адзін ад аднаго павышаецца роля і значэнне міжасобасных адносін і камунікацыі, маральнасць іншага чалавека зробіцца ўмовай свабоды і жыццёвага поспеху індывіда. Будзе прызнана этыка ненасілля як прынцып выжывання не за кошт іншых, а праз узаемавыгаднае супрацоўніцтва.

Між тым новая якасць грамадскага жыцця зможа рэалізавацца толькі ў пэўных рэгіянальных формах. А гэта ставіць жыццёва неабходнай мэтай распрацоўку **беларускага сацыякультурнага праекта** як адказу на выклікі часу: агульнацывілізацыйныя і рэгіянальныя

(пошук цэласнай сацыяльна-эканамічнай і полікультурнай мадэлі развіцця ў межах апазіцыі Захад—Усход, фармаванне аўтэнтычных нацыянальна-культурных структур ідэнтычнасці, распрацоўка сучасных аптымальных формаў грамадска-дзяржаўнага і народнага самакіравання).

Вылучаныя сацыякультурныя фактары (тэндэнцыі) утвараюць рамку патрабаванняў да дзейнасці праекціроўшчыка адукацыі XXI ст., паколькі ў саміх педагагічных сістэмах, якія зараз ствараюцца, павінен змяшчацца адказ на актуальныя пытанні свайго часу і перспектывы грамадскага развіцця. Такім чынам, адукацыйны праект для Беларусі XXI ст. павінен зрабіцца неад'емнай часткай усяго беларускага сацыякультурнага праекта.

Далей мы разгледзім контуры адукацыйнага праекта Беларусі XXI ст. і звязаныя з ім парадыгмальныя зрухі ў адукацыі.

Паколькі паняцце "парадыгма" было ўведзена амерыканскім метадолагам навукі Томасам Кунам у якасці сродку аналізу характару развіцця тэарэтычнай фізікі, пастолькі яго экстрапаляцыя на іншыя прыродазнаўчыя дысцыпліны адбывалася ў асноўным даволі лёгка. Ужыванне гэтай катэгорыі для аналізу працэсаў, што адбываюцца ў гуманітарным пазнанні, запатрабавала шэраг змяненняў, якія ўлічваюць спецыфіку апошняга. Напрыклад, педагогіка як дысцыпліна тэлеалагічнага характару ў будаванні сваіх сістэм можа адначасова зыходзіць з розных падстаў, падзяляць ідэалы і нормы, што прымаюцца далёка не ўсёй супольнасцю. У выніку ў адносінах да педагагічнай навукі лепш гаварыць пра поліпарадыгмальнасць і метадалагічны плюралізм.

У беларускай педагогіцы становішча пагаршаецца яшчэ і за кошт таго, што тут увогуле даволі складана адназначна кваліфікаваць тую ці іншую тэарэтычную канструкцыю, паколькі яна практычна заўсёды эклектычная, унутрана супярэчлівая з-за асіміляцыі розных культур, канфесій і падыходаў. Разам з тым задача аналізу педагагічных парадыгмаў аказваецца цяжкавырашальнай і ў выніку нераспрацаванасці філасофіяй і метадалогіяй адукацыі неабходных рэфлексіўных сродкаў.

Такім чынам, супярэчнасць паміж патрэбай педагагічнай практыкі ў сутнасных зменах, якія, у сваю чаргу, абумоўлены парадыгмальнымі трансфармацыямі, і метадалагічнай няспеласцю нацыянальнай педагогікі як навукі — адзін з фактараў парадыгмальных змяненняў. Назавём гэтыя змены ўнутрыпарадыгмальнымі. Іх сутнасцю з'яўляецца фармаванне і развіццё філасофска-метадалагічнай рэфлексіі з далейшым самавызначэннем тэарэтычных даследаванняў.

Другі тып змяненняў мае ўласна парадыгмальны характар, калі вядзецца пераканструяванне саміх сістэмаўтваральных асноў парадыгмаў. Для аналізу гэтай з'явы можна выкарыстаць навуковую рэфлексію (уведзена В.С.Сцёпіным), што карэлюе з паняццем "парадыгма". Размова ідзе пра ўключэнне ў структуру навуковых сістэм наступных элементаў: ідэалы і каштоўнасці навукі, навуковая карціна свету, філасофскія асновы навукі (гл. Научные революции в динамике культуры. — Мн.: Университетское, 1987. — С. 41).

Сістэмаўтваральнай асновай навуковай сістэмы з'яўляецца навука-ўзор, паводле падабенства з якой будуюцца іншыя дысцыпліны. Для многіх навук XX ст. такім узорам выступала і выступае тэарэтычная фізіка. Імкненне адпавядаць фізіцы і ў адзінстве асноў і ў строгасці метаду ў многім спрыяла не толькі развіццю педагагічных ведаў, але і выклікала цалкам акрэслены "комплекс непаўнацэннасці" ў педагогіцы. Міждысцыплінарнае ўзаемадзеянне навук (спецыялізацыя і інтэграцыя), выступаючы фактарам па-

радыгмальных зменаў, прывяло да дыскрэдытацыі фізікі і ў цэлым прыродазнаўчых ведаў як узорных. Адкрыццё залежнасці параметраў дследуемага аб'екта ад сродкаў пазнання і пазнавальных аперацый, а ў далейшым і ад пазіцыі назіральніка, каштоўнасцяў і мэтаў навукоўца выклікала да жыцця ўзоры ўласна гуманітарнага пазнання. У выніку ідэалы і нормы сучаснага даследавання ўсё больш імкнуцца да прад'яўлення даследчыкам сваіх падстаў, навуковых сродкаў, узбагачэння пазнавальных стратэгій філасофска-метадалагічнымі структурамі. У педагогіцы гэта выяўляецца праз сцвярджэнне прынцыпу імплікатыўнасці "калі.., то...".

Аднак акрэсленая тэндэнцыя — толькі перспектыва развіцця педагагічнай парадыгмы на Беларусі. У масавай навуковай практыцы пануюць узоры класічнай фізікі з іх прынцыпамі эмансіпацыі і "адчужэння" аб'екта пазнання ад статусу навукоўца ў якасці "абсалютнага назіральніка". У гэтай сувязі імператывы некласічнай і тым больш постнекласічнай рацыянальнасці застаюцца жаданай будучыняй, і ў такім жа напрамку можна прагназаваць далейшае развіццё адукацыйных парадыгмаў.

Важным фактарам парадыгмальных змен у навуцы выступае звычайна змяненне ўяўленняў пра аб'ект даследавання. Для педагогікі перамяшчэнне фокуса вывучэння з інстытутаў і функцый адукацыі на суб'ект адукацыі абазначае цэлую рэвалюцыю ў метадалогіі і практыцы навуковага пошуку. Гэта праяўляецца як у спецыфіцы аб'екта (асобе), які валодае сустрэчнай актыўнасцю, так і ва ўсведамленні навукоўцамі таго факта, што ўплыў (фармаванне) даследчыка на аб'ект робіцца іманентнай характарыстыкай любой працэдуры вывучэння.

Педагагічная парадыгма, арыентаваная на чалавека, набывае ўсё больш комплексны (сферны) характар. Справа ў тым, што чалавек пры монадысцыплінарным даследаванні заўсёды падпадае пад істотную рэдукцыю. Гэта выклікала да жыцця навуку і практыку — педалогію. Аднак адсутнасць метадалагічных сродкаў суарганізацыі ведаў рознага тыпу і іх механічнае спалучэнне прывялі да краху яе спроб цэласнага асэнсавання і развіцця чалавека. Зараз жа філасофія і метадалогія педагогікі валодаюць сродкамі пабудовы мадэляў-канфігуратараў, што дазваляюць сінтэзаваць монапрадметныя ведавыя арганізаванасці ў комплексныя структуры.

Такім чынам, развіццё метадалагічных сродкаў навуковай дзейнасці можа быць разгледжана ў якасці вядучага фактару парадыгмальных зменаў у педагагічнай навуцы.

Пералічым, не раскрываючы дэталёва, асноўныя асаблівасці педагагічнай навукі XXI ст., якія, на наш погляд, можна зафіксаваць ужо сёння. Да іх адносяцца:

1. Прыярытэтнае развіццё філасофіі і метадалогіі адукацыі.

2. Сцвярджэнне ў педагагічных даследаваннях культуралагічнага падыходу, праектнага мыслення, прынцыпаў полідысцыплінарнасці і комплекснасці.

3. Павелічэнне "ўдзельнай вагі" сістэмных даследаванняў, звязаных з новымі роляй і функцыяй сферы адукацыі ў грамадскім жыцці XXI ст.

4. Складванне педагагічнай навукі як практыкаарыентаванай гуманітарнай навукі праектна-праграмнага тыпу.

Асобна належыць сказаць пра філасофію адукацыі XX ст. Як ужо адзначалася, адукацыя XXI ст., на наш погляд, будзе выступаць у якасці прадмета свядомага канструявання многімі грамадскімі суб'ектамі новай адукацыйнай практыкі (адукацыя як праект). Яе асноўным накірункам павінна зрабіцца ўстаноўка на светапоглядны плюралізм, разнастайнасць ідэалаў грамадскага ладу і шляхоў іх дасягнення. Натуральна, што законы існавання соцыума ў такім выпадку раз-

глядаюцца не толькі як аб'ектыўныя, але таксама і як вытворныя, залежныя ад дзейнасці асобных людзей і іх калектыўных намаганняў. Гэта значыць, адбудзецца змена ўстаноўкі з "боскага прадвызначэння" праз "навукова абгрунтаваную аб'ектыўную неабходнасць" да "вольнага і адказнага самавызначэння", калі чалавек атрымлівае права дзейнічаць "паводле свайго хацення", рэалізоўваць мноства магчымасцяў...

У новым праекце навучанне культуры самавызначэння павінна скласці змест адпаведнай практыкі адукацыі (гл. Концепция национальной школы Беларуси. Мн.: НИО, 1993. — С. 19—20). Цяпер ся-род беларускіх тэарэтыкаў, філосафаў адукацыі ўсталёўваецца думка аб тым, што змены, якія назіраюцца ў прынцыпах, змесце, тэхналогіях адукацыі, маюць сугнасны парадыгмальны характар.

На думку В.П.Старжынскага, рэформа адукацыі ў рэспубліцы прадугледжвае змяненне наступных базавых педагагічных прынцыпаў:

1. Змена прадметнай арганізацыі зместу адукацыі. Пераход ад навуковых дысцыплін да міждысцыплінарных праблем.

2. Змена метадаў адукацыі. Пераход ад сузіральных метадаў, якія ляжаць у аснове навуковага падыходу, да актыўных — аўтадыдактызму і самаадукацыі.

3. Змена мэтаў адукацыі: ад ведаў, уменняў і навыкаў — да асобаснага развіцця.

4. Змена механізмаў адукацыі. Пераход ад сацыялізацыі да індывідуальна-асобаснага развіцця.

5. Змена сродкаў адукацыі. Пераход ад навукі як асновы зместу адукацыі да культуры ў цэлым (гл. Старжинский В.П. Стереотипы и динамика мышления. — М., 1993. — С. 240).

З нашага пункту погляду, контуры адукацыйнага праекта XXI ст. для Беларусі павінны, з улікам вышэйпададзенага, базавацца на наступных прынцыпах:

1) праектнага модуса адукацыі ў эпоху постмадэрнізму;

2) вядучай ролі адукацыі ў адносінах да ўсяго соцыума, калі адукацыя выступае сродкам і механізмам грамадскага развіцця;

3) прыярытэтнага развіцця адукацыі ў параўнанні з іншымі сферамі сацыяльнага жыцця;

4) культуратворчай місіі адукацыі.

Сутнасцю новай педагогікі павінна стаць уключэнне падрастаючых пакаленняў у працэсы сацыякультурнага ўпарадкавання сваёй "малой радзімы" шляхам развіцця ў іх універсальных здольнасцяў, якімі забяспечваецца сацыякультурнае самавызначэнне. Гэта ажыццяўляецца шляхам замены працэсу перадачы інфармацыі (назапашаных старых ведаў) развіццём спосабаў мыслення і дзейнасці, што забяспечваюць імправізаванае ўзнікненне новых ведаў, нестандартных метадаў іх ужывання ў розных сітуацыях.

Калі раней у працэсе адукацыі дзеці вучыліся ў мінулага, то сёння настаў час вучыцца ў будучага, набліжаючы і апярэджваючы яго. Спадчына мінуўшчыны пры гэтым не адмаўляецца, а толькі пераасэнсоўваецца. Будучыню належыць яшчэ пабудаваць. Аднак, калі дастаткова грунтоўна і глыбока ўглядацца ў будучае, арыентавацца на яго парасткі, яно будзе прыадкрывацца, арганічна ўваходзіць у сучаснасць.

Больш падрабязна разгледзім адукацыю як фактар фармавання будучага і інстытут, адкрыты для будучыні.

Доўгі час у літаратуры па тэорыі педагогікі сувязь паміж грамадствам і адукацыяй як адным з яго інстытутаў уяўлялася адназначна — як залежнасць адукацыі, яе зместу і метадаў ад узроўню развіцця грамадскіх адносінаў. У СССР стаўленне да сацыякультурнага інстытута адукацыі задавалася агульнай ідэалогіяй марксізму, у якой адукацыя з'яўляецца надстроечным інстытутам, а

таму — залежным, прадвызначаным базісам.

Праўда, неабходна прызнаць, што такія адносіны да інстытута адукацыі былі ўласцівы не толькі марксізму, а, бадай што, усёй навукова-арыентаванай гуманітарнай думцы Новага часу. На працягу XVIII—XIX стст. гуманітарныя навукі развіваліся, маючы ў якасці ўзору формы навуковасці, што складваюцца ў прыродазнаўчых навуках. Як вядома, у апошніх адной з асноўных катэгорый з'яўляецца катэгорыя закону. Матэрыяльным працэсам у гэтым выпадку надаецца статус заканамернасцяў, якім падпарадкоўваецца жыццё прыродных аб'ектаў. Законы прыроды, якія адкрывае чалавечы розум, не залежаць ад дзейнасці людзей. Чалавеку застаецца толькі падпарадкоўвацца гэтым заканамернасцям, выкарыстоўваць іх у сваіх мэтах. Зыходзячы з гэтага і распрацоўваліся такія формы чалавечай практыкі, як інжынерыя і тэхніка.

Пераносячы прыродазнаўчую ідэалогію на сацыяльныя працэсы, мысліцелі XIX ст. спрабавалі адшукаць і ў чалавечай гісторыі такія працэсы, якім можна было б прыпісаць статус аб'ектыўных, натуральных заканамернасцяў. Карл Маркс замацаваў дадзеную навуковую ўстаноўку ў канцэпцыі натуральна-гістарычных законаў, якім нібыта падпарадкоўваецца сацыяльнае жыццё чалавецтва.

Адзначаны падыход абумоўліваў пункт погляду і на адносіны грамадства і адукацыі. Як грамадскае жыццё мыслілася залежным ад дэсуб'ектаваных гістарычных законаў, так і адукацыя ўяўлялася залежнай ад сацыяльных і культурных працэсаў, ад узроўню развіцця грамадскіх, вытворчых адносінаў. Якое грамадства — такая і адукацыя. Актуальны сацыяльны заказ, маўляў, прадвызначае характарыстыкі адукацыйнага працэсу, а галоўнае — вымалёўвае вобраз неабходнай дадзенаму грамадству асобы, вызначаючы тым самым змест адукацыі. З другога боку, даследчыкі зафіксавалі і такую відавочную рэч: інстытут адукацыі ўзнікае ў гісторыі менавіта для задач сацыяльнага ўзнаўлення, падрыхтоўкі людзей да рэалізацыі тых або іншых грамадскіх (дзяржаўных або вытворчых) функцый. Значыць, лічылі гісторыкі, сістэма адукацыі "паводле прызначэння" заклікана забяспечваць працэсы грамадскага ўзнаўлення і эфектыўнага сацыяльнага функцыянавання. А гэта якраз і наканоўвае адукацыі другасную ролю і функцыю ў сацыяльным жыцці.

Усе вышэйадзначаныя палажэнні ў пэўнай ступені, безумоўна, слушныя. Адукацыя, як і любы іншы "надстроечны" інстытут, форма грамадскай свядомасці, залежыць ад узроўню развіцця сукупнай чалавечай культуры, назапашанай і рэалізаванай у сацыяльнай "тканіне" таго або іншага грамадства. Аднак характар гэтай залежнасці абумоўлены прыродазнаўчай, натуральна-гістарычнай рацыянальнасцю, што ў гэтым выпадку служыць ідэалагічнай формай, праз прынясце і веру ў якую ўсталёўваюцца, ствараюцца ў жыцці якраз тыя адносіны паміж грамадствам і адукацыяй, якія нібыта толькі адкрываюцца, рэканструююцца ў гістарычным даследаванні.

Навуковая рэвалюцыя ў фізіцы пачатку XX ст. узяла пад сумненне зыходныя пастулаты, на якіх будавалася ўся прыродазнаўчая, класічная рацыянальнасць. Далейшы метадалагічны аналіз выявіў, што вывады павінны датычыцца таксама і гуманітарных навук, дзе залежнасць атрыманых ведаў ад пазіцыі даследчыка была яшчэ больш відавочнай. Больш таго, у гуманітарных навуках значна мацней выяўляецца залежнасць аб'екта вывучэння ад самога чалавека. Ужо ў неакантыянстве пачатку стагоддзя было сфармулявана адрозненне навук пра прыроду і навук пра дух. Паступова ў гу-

манітарнай думцы замацоўвалася палажэнне пра штучны характар як сацыяльных, так і псіхалагічных законаў, іх залежнасці ад самавызначэння чалавека, адсутнасці ў іх "чыстай" аб'ектыўнасці, якая адназначна прадвызначае жыццялогіку і накірунак.

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і пераход развітых краін у фазу постіндустрыяльнага інфармацыйнага развіцця ператварылі чалавечы фактар з тэарэтычнага палажэння, у якім увасобілася новая сацыякультурная ідэалогія, у сродак вырашэння актуальных сацыяльных праблем. Дынамізм грамадскага жыцця паўстаў у наяўнасці. Відавочнай зрабілася і залежнасць сацыяльнага жыцця ад розных "ідэальных" фактараў. Даследчыкі павялі размову пра эпоху інфармацыйнага грамадства (Д.Бел), пра зрух улады ад розных формаў насілля і багацця да ўлады ведаў (Э.Тофлер), пра пераўтварэнне чалавечага розуму ў геалагічны фактар (У.І.Вярнадскі). У Маскоўскай метадалагічнай школе была распрацавана так званая сістэмна-мыслядзейнасная метадалогія, выходнае палажэнне якой — у тым, што неабходна змена карціны свету з прыродазнаўчай, прадметам якой з'яўляецца прырода, на дзейнасную, дзе менавіта чалавечая дзейнасць з'яўляецца фактарам, што канстытуіруе як карціну свету, так і сам свет. Пры гэтым павінна змяніцца разуменне адносін паміж чалавечым быццём і мысленнем, г.зн. чалавечая свядомасць, мысленне і дзейнасць у значна большай ступені, чым гэта лічылася раней, ствараюць навакольны свет.

Чалавек мае права і здольны ствараць сваю гісторыю і як асабістую, і як сацыяльную. Паколькі менавіта інстытут адукацыі працуе з чалавекам, фармуе яго, то і адукацыя можа непасрэдна ўплываць на сацыяльнае развіццё. Так, у межах новай рацыянальнасці пачалі істотна пераасэнсоўвацца адносіны паміж адукацыяй і грамадствам. Калі чалавек можа ўплываць на сваё жыццё, змяняць яго абставіны і тым самым самога сябе, то і адукацыя, развіваючы чалавека, можа тым самым развіваць і сацыяльныя ўмовы свайго існавання. Больш таго, адукацыя можа станавіцца нават вызначальным фактарам сацыяльнага і культурнага развіцця. Забароны на такі мысліцельны падыход больш не існуе. Між іншым, само жыццё на Зямлі падштурхоўвае да прыняцця гэтай пасылкі. Асабліва даволі відавочныя і вострыя глабальныя праблемы, з якімі сутыкнулася ўсё чалавецтва і вырашэнне якіх у многім упіраецца ў крызіс самога чалавека.

Змяненне адносін паміж грамадствам і адукацыяй абазначае, што апошняя заклікана зрабіцца магутным антыкрызісным фактарам грамадскага развіцця, рэальным сродкам забеспячэння нацыянальнай і міжнароднай бяспекі, адным з вядучых механізмаў развіцця ўсіх сфер чалавечай жыццядзейнасці. У адукацыі, як адзначае прэзідэнт Маскоўскай Акадэміі развіцця адукацыі Ю.Грамыка, могуць і павінны прайгравацца перспектывы развіцця, будучыня сацыяльных, культурных і вытворчых сістэм. Пры такім падыходзе адукацыя становіцца глабальным мэтасродкам чалавецтва для збудавання сваёй будучыні. Яна павінна адкрыцца будучаму, контуры якога пакуль яшчэ нічым не абумоўлены, а гістарычнае выйсце ўяўляецца незразумелым. Толькі такім чынам можна будзе пераадолець глабальны крызіс чалавечай цывілізацыі, пазбегнуць агульнацывілізацыйнай катастрофы.

Ідэя адукацыі, адкрытай для будучыні, якая выступае асноўным сродкам фармавання, ужо знайшла сваю прапрацоўку ў Канцэпцыі прагнозу развіцця расійскай адукацыі да 2015 г. Мяркуецца стварыць інтэлектуальна насычаныя адукацыйныя сістэмы, у межах якіх нашчадкі здолеюць "прайграць" і рэальна пражыць гістарычную перспектыву сваіх

рэгіёнаў і краіны ў цэлым. Прычым размова ідзе не пра ўдасканаленне існуючых сістэм адукацыі, а пра тое, каб стварацьзоны апераджальнага развіцця людзей, іх спосабаў мыслення і дзейнасці. Аўтары згаданай Канцэпцыі лічаць, што, калі ў далейшым будзе толькі паляпшацца існуючая адукацыя з яе тэхналогіямі, то зрабіць сур'ёзнага "рыўка" не ўдасца. Сістэмы адукацыі будуць па-ранейшаму ўзнаўляць усе беды і недахопы наяўнага грамадскага жыцця. Для практыкі ж развіцця адукацыя павінна быць сфармавана ў выглядзе палісферы праектаў і праблем, праз якія вывучалася і апрабоўвалася б магчымае, але рэальнае будучае. Інакш кажучы, новыя формы арганізацыі адукацыі павінны арганічна ўключыць пакаленне, што зараз фармуецца, у праграмаванне і будаўніцтва сваёй будучыні.

Асноўным сродкам рэалізацыі гэтай задумы з'яўляецца стварэнне сеткі рэгіянальных эксперыментальна-адукацыйных цэнтраў. Яны павінны быць ва ўсіх мясцовасцях, якія маюць своеасаблівыя культурна-гаспадарчыя ўмовы і нацыянальны склад насельніцтва.

Каб адукацыя выступала сродкам фармавання будучыні, на думку аўтараў расійскай Канцэпцыі, неабходна:

1. Развіваць адукацыю як антыкрызісны фактар, які спрыяе пераадольванню недахопаў у эканоміцы і соцыуме, вырошчванню новых эфектыўных формаў гаспадарання, кіравання і сацыяльных сувязяў.

2. У змесце адукацыі і яе арганізацыі неабходна адлюстроўваць праблемнамэтавае развіццё рэгіёна і краіны ў цэлым.

3. Уключаць у змест адукацыі якасны рух наперад у навуках, дасягненні інжынерыі, тэхнікі, сацыяльнай і духоўнай творчасці. Прычым прадметам вывучэння павінны быць не факталагічная інфармацыя аб гэтых феноменах, а агульныя метады і спосабы іх атрымання (ідэя дзейнаснага зместу адукацыі).

### Да новай парадыгмальнай тэхналогіі

(Замест заключэння)

Складванне адукацыйнай практыкі XXI ст. прадугледжвае тэхналагічнае афармленне новых спосабаў педагагічнай дзейнасці, накіраваных на фармаванне ў навучэнцаў здольнасцяў да сацыякультурнага самавызначэння асобы.

У якасці вядучай педагагічнай тэхналогіі адукацыйнага праекта XXI ст. можа быць разгледжана тэхналогія забеспячэння самавызначэння асобы ва ўсіх сферах яе жыццядзейнасці. Тады асноўнай задачай педагогікі будзе ўключэнне падрастаючых пакаленняў у працэсы сацыякультурнага будаўніцтва. Педагагічная тэхналогія самавызначэння, на наш погляд, павінна рэалізоўвацца як рэфлексіўна-дзейнаснае навучанне. Гэта прадугледжвае такія формы навучання, якія адрозніваюцца ад класнаўрочных: гульня (тэатр), калектыўнае даследаванне і праектаванне, праблемная групавая дыскусія, самаадукацыя.

Вучоба новага тыпу ўяўляецца як складанаарганізаваная дзейнасць навучэнцаў па стварэнні будучыні. Яна складаецца з дзеянняў па аналізе сітуацыі, самавызначэнні, праектаванні, распрацоўцы праграм дасягнення мэтаў.

Асаблівасцю вучэбнай дзейнасці новага тыпу будзе з'яўляцца прэваляванне працэсаў спасціжэння прадметаў культуры (герменеўтычнай практыкі), канструктыўнай жыццятворчасці над абстрактным пазнаннем навуковага тыпу.

На заканчэнне артыкула хацелася б выказаць і некалькі заўваг.

Думаецца, што структура адукацыі XXI ст. на Беларусі будзе складвацца пад уплывам асобных дзейных фактараў: станаўлення грамадзянскай супольнасці

насці, мультыкультуральнасці, дагаяльнай анклаўнай мадэрнізацыі. Гэта азначае адначасовае разгортванне ў сацыякультурнай прасторы рэспублікі вялікай колькасці педагагічных ініцыятыў адпаведна заказам, якія фармуюцца ў грамадстве, на адукацыйныя паслугі. У гэтай сувязі кіраванне адукацыяй пачне арыентавацца не на ўстановы і інстытуты, а на працэсы грамадскага жыцця, іх дыферэнцыяцыю і развіццё, г.зн. гуманітарная падтрымка і экспертыза інавацый стане вядучай функцыяй кіраўніцкіх інстанцый.

Адначасова — у сувязі са станаўленнем структур грамадзянскай супольнасці — сістэма кіравання адукацыяй будзе набываць усё больш грамадска-дзяржаўны характар, забяспечваючы баланс інтарэсаў розных сацыяльных груп, рынак адукацыйных паслуг.

Між тым асаблівасці мадэрнізацыі ў рэгіёне Беларусі, гаспадарчая шматукладнасць рэспублікі выклічуць да жыцця асаблівы тып арганізацыі адукацыйнай практыкі праз стварэнне "пунктаў прарыву" — адукацыйных эксперыментальных пляцовак, на якіх будуць пастаянна мадэлявацца і апрабоўвацца ўзоры новай адукацыі.

Асноўным накірункам рэалізацыі гэтай задумы можа быць сетка рэгіянальных эксперыментальна-адукацыйных цэнтраў — пайдэяполісаў. Іх ідэя заключаецца ў тым, каб ва ўмовах культурна і інтэлектуальна насычанай прасторы выпрацаваць перспектыўныя напрамкі навукова-тэхнічнага прагрэсу і новыя формы эфектыўна-грамадскай арганізацыі жыцця людзей. Па меры станаўлення гэтых практык-узораў яны пачнуць распаўсюджвацца на блізкія і далёкія рэгіёны рэспублікі.

Педагагічная адукацыя будучыні, магчыма, стане будавацца як імітацыйна-дзейнасная адукацыя, што ўключае ў сваю структуру прафесійнае самавызначэнне, сцэнараванне, мадэляванне і праектаванне адукацыйных практык.

Безумоўна, зменяцца роля і месца сістэмы павышэння кваліфікацыі работнікаў адукацыі. Інстытуты паслядыпломнай адукацыі пераўтворацца ў рэгіянальныя цэнтры развіцця, у сродак эвалюцыйнай трансфармацыі педагагічных сістэм, вядучы механізм развіцця адукацыі.

# Моделирование творчества

***М.В.Акельев,***
*младший научный сотрудник НИО*

Главная отличительная черта моделирования как метода научного познания состоит в том, что человек, ставящий перед собой цели исследовательского характера, использует для исследования интересующего его объекта другой объект, замещающий в этом случае первый (Б.А.Глинский).

Моделирование — метод познания интересующих нас качеств объекта через модели. Это — действие с моделями, позволяющее исследовать отдельные интересующие нас качества, стороны или свойства объекта или прототипа (В.В.Давыдов, А.У.Варданян).